***А. А. Дошчачка,***
***Д. А. Працко***
*Навуковы кіраўнік*
***К. Р. Федарцова***
*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# ПАТРЫЯТЫЗМ ПРАЗ ГАДЫ І ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Патрыятызм – гэта асаблівая частка нашай ідэнтычнасці, здольная аб’яднаць нацыю. Ён фарміруецца на працягу ўсяго жыцця, уплываючы на погляды, паняцці, дзеянні і ўчынкі чалавека. Нямногія рэчы могуць расквеціць патрыятызм у нашых сэрцах так, як наша краіна Беларусь. Фарміраванне патрыятызму залежыць ад шматлікіх фактараў нашага жыцця, але адным з галоўных і пачатковых фактараў адчування патрыятызму з’яўляецца сям’я. Бацькі расказваюць сваім дзецям пра гісторыю нашага народа, падмацоўваюць гонар за беларускую культуру і мову. Жыццёвыя прыклады бацькоў, іх словы ўзмацняюць у дзяцей любоў да роднага краю. Сямейнае выхаванне адыгрывае важную ролю ў фарміраванні патрыятызму ў падрастаючага пакалення.

Навучанне ў школе пашырае веды падлеткаў пра нашу краіну і яе славутых прадстаўнікоў на матэрыяле розных вучэбных прадметаў: “Чалавек і свет”, “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”, “Мастацтва”, “Геаграфія”, “Біялогія”, “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі” і інш. Вучні актыўна ўдзельнічаюць у грамадскіх і культурных мерапрыемствах, конкурсах і выступленнях на патрыятычную тэматыку. Школьная адукацыя выхоўвае ў навучэнцаў пашану да герояў беларускага народа і нацыянальных сімвалаў. Патрыятызм у моладзі ўзрастае праз падтрымку сваёй краіны ў складаныя часы, напрыклад, удзел у акцыі “Дай лесу новае жыццё!” па аднаўленні беларускіх лясоў пасля разгулу стыхіі ў ліпені 2024 г.; удзел у дабрачынных акцыях, суботніках, навядзенні парадку на брацкіх магілах і г. д. Таксама павялічваецца пачуццё патрыятызму ў радасныя моманты для нашай краіны: поспех беларускіх спартсменаў на алімпіядах і іншых сусветных спаборніцтвах, палёт першай беларускі Марыны Васілеўскай у космас, перамога нашых спевакоў, музыкаў і танцораў у розных конкурсах і інш. Гэта ўсё тое, што робіць нас сапраўднымі патрыётамі, гатовымі абараняць сваю краіну і ганарыцца ёю.

Мы – адзін народ, адзінае сэрца з аднымі мэтамі. Моладзь Беларусі павінна быць смелай, ініцыятыўнай, дружнай, адданай сваёй Радзіме, каб кожны змог знайсці сваё месца ў жыцці і прыносіць карысць грамадству. Патрыятызм – гэта вялікае і моцнае пачуццё прыналежнасці да свайго народа, краіны і культуры. Калі мы будзем усведамляць, што наша краіна – гэта самы лепшы дом для нас; усё, што наша беларускае, – лепшае, таму што роднае, тады і пачуццё патрыятызму будзе толькі павялічвацца ў нас саміх. Таксама важна памятаць, што патрыятызм – гэта не толькі гонар за краіну, але і захаванне яе культурнай спадчыны, мовы і традыцый, а таксама гістарычнай праўды і памяці.

Памяць можа быць усенародная, сямейная. Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (воіны, партызаны, працаўнікі тыла) аб’ядноўваюць як усенародную і сямейную памяць, так і трагедыю – усенародную, сямейную, асабістую. Дзмітрый Максімавіч Мачалоў (прадзед А. Дошчачкі, аднаго з суаўтараў артыкула) – непасрэдны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны – пачуццё патрыятызму загартоўваў на фронце, абараняючы савецкую зямлю ад ворага, губляючы таварышаў, выжываючы ад голаду, хвароб і раненняў. Ён ваяваў на шасці франтах: Ленінградскім, Варонежскім, Сцяпным, Сталінградскім, Паўднёва-Заходнім, 3-м Украінскім. Удзельнічаў у трох вялікіх і страшных бітвах: за Ленінград, Сталінград і на Курскай дузе. На рахунку Дзмітрыя Мачалова – 159 баявых вылетаў. Ён быў адзначаны шматлікімі ўзнагародамі як у ваенны, так і ў мірны час. Найбольш знакавымі для сябе ўзнагародамі Дзмітрый Максімавіч лічыў медаль “За абарону Ленінграда” і два ордэны “Чырвоная Зорка” пасля ранення пад Ленінградам і пасля выратавання камандзіра палка ў адной схватцы ў небе.

Свой 19-ы дзень нараджэння (ноччу з 7 на 8 лістапада 1941 г.) Дзмітрый Мачалоў запомніў на ўсё жыццё, паколькі для яго гэта быў першы бой і першае раненне. У раёне вёскі Неўская Дуброўка рака Нява была 800 м шырынёй і з коркай лёду. Правы бераг быў наш, а на левым – фашысты. Пяхоту садзілі на лодкі, не даплываючы 15–20 метраў да супрацьлеглага берага, трэба было ісці ўброд, а потым – у атаку з вінтоўкамі. Калі ў затвор вінтоўкі трапляў пя-

сок, то страляць не будзе. Тады была надзея толькі на нож. У тым рукапашным баі Дзмітрый Мачалоў атрымаў штыкавое раненне, але не разгубіўся: запоўз пад падбіты нямецкі танк, неяк перавязаў рану. Ад таго, што страціў шмат крыві, пакутаваў ад смагі. Не вытрымаў, пад кулямі папоўз да ракі. Там, на водмелі, – уперамешку трупы савецкіх байцоў і ворагаў. Зняў каску, зачарэпнуў вады, а яна – ружовая. Усё роўна напіўся. Змог трапіць у санітарную лодку, дабрацца да таго берага. Гэты левы бераг Нявы назвалі Неўскі пятачок, з якім звязаны цяжкія і драматычныя эпізоды абароны Ленінграда, бо баі тут вяліся 265 сутак.

У кастрычніку 1942 г. Дзмітрый Мачалоў прымаў удзел у абароне г. Сталінграда, калі ў дзень рабілі па 2–3 вылеты. “Кожны з іх – гэта цэлае жыццё, – успамінаў ветэран, – знаходзячыся над цэллю, пад ураганным варожым агнём, я не думаў пра сябе... Згадваюцца зімовыя баявыя палёты. Моцныя маразы, холад прабіраецца праз футравы камбінезон і унты. На падыходзе да цэлі – узбуджэнне нерваў, бо даводзілася атакаваць ворага на вышыні ўсяго 80–100 метраў...”. Штурмавік, на якім лятаў Дзмітрый Мачалоў, фашысты празвалі “чорнай смерцю”. Ён меў на сваім ўзбраенні дзве буйнакаліберныя пушкі, тры буйнакаліберныя кулямёты, бомбы і рэактыўныя снарады. Аднак самалёт быў напалову браніраваны – толькі матор і кабіна пілота. Кабіна паветранага стралка была фанерная. Па гэтай прычыне паветраных стралкоў называлі смяротнікамі, паколькі ў такой кабіне падчас бою мала хто выжываў. Нават праз дзесяцігоддзі слова “Сталінград” узмацняла стук сэрца Дзмітрыя Максімавіча.

Затым былі цяжкія баі ў 1943 г. на Курскай дузе, якія ў памяці ветэрана зліліся ў адну жорсткую схватку.

Вайна для Дзмітрыя Мачалова закончылася пасля вызвалення Адэсы, у пачатку красавіка 1944 г., калі ён атрымаў накіраванне ў 1-е Маскоўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Будучы курсантам, прымаў удзел у Парадзе Перамогі 24 чэрвеня 1945 г., да якога рыхтаваліся два з паловай месяцы. У дзень Парада быў моцны дождж, аднак гэта не перашкодзіла іх вучылішчу заняць першае месца сярод навучальных устаноў, што ўдзельнічалі ў Парадзе. У напамін пра гэта – каленкоравае чырвонае пасведчанне да медаля “За Перамогу над Германіяй”, такія былі толькі ва ўдзельнікаў Парада, у астатніх ветэранаў – жоўтыя, кардонныя (малюнак).



**Дзмітрый Максімавіч Мачалоў**

Дзмітрый Максімавіч Мачалоў у арміі і на вайне быў марскім пехацінцам, паветраным стралком, пасля Вялікай Айчыннай вайны служыў у войску штурманам, з цягам часу атрымаў званне падпалкоўніка. Акрамя ваеннай справы, ён быў лектарам таварыства “Веды”, праводзіў патрыятычна-выхаваўчую работу: з’яўляючыся членам гарадскога савета ветэранаў г. Маладзечна, выступаў перад моладдзю, на мітынгах. Таксама ветэран іграў на музычных інструментах (баяне, акардэоне); самастойна асвоіў мастацтва гравіроўкі на шкле, пластмасе, метале; захапляўся ўсходняй мудрасцю: ведаў шмат афарызмаў. Дзмітрый Максімавіч пражыў больш за 80 гадоў. Яго доўгае жыццё было не толькі цяжкім, насычаным выпрабаваннямі і смяротнай рызыкай, але і цікавым, разнапланавым, прасякнутым любоўю да Радзімы, яе народа і сваёй сям’і.

Гісторыя Дзмітрыя Максімавіча Мачалова кранае сэрца нас, яго нашчадкаў, умацоўвае разуменне ўсёй важнасці патрыятызму і ведання гісторыі нашай краіны. Патрыятызм – гэта не толькі мерапрыемствы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, гэта і думкі, што ўзнікаюць пасля знаёмства з такімі людзьмі, гісторыямі ветэранаў і герояў Вялікай Айчыннай вайны, якіх ужо няма ў жывых. Нашы дзяды і прадзеды падарылі нам мірнае неба над галавой праз тысячы смерцяў і літры пралітай крыві. Мы павінны памятаць гэтыя падзеі і распавядаць пра іх сваім будучым дзецям, бо мы – адзіная краіна, а наша адзінае сэрца – Беларусь.